УДК 1(476)(091)+2(476)

# КАНФЕСІЙНАЯ СПЕЦЫФІКА СУЧАСНАЙ УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

***В. У. Старасценка***
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова

*Артыкул прысвечаны спецыфіцы і дынаміцы развіцця рэлігійнай структуры ўсходняй Беларусі, якая разглядаецца ў кантэксце рэспубліканскай веравызнальнай сітуацыі. На аснове шырокага статыстычнага матэрыялу паказаны рэгіянальныя асаблівасці і тэндэнцыі канфесійных працэсаў. Раскрыты адметныя характарыстыкі рэгіёна ў адносінах да рэлігійнай і канфесійнай самаідэнтыфікацыі насельніцтва.*

**Ключавыя словы:** рэлігія, канфесія, усходняя Беларусь, рэлігійныя працэсы, канфесійная дынаміка, рэлігійная структура.

## Увядзенне

Значным аспектам айчыннага рэлігіязнаўства выступае даследаванне сучаснай рэлігійнай сітуацыі і развіцця веравызнальнай сферы Беларусі, якое ўключае аналіз канфесійных асаблівасцей рэгіёнаў краіны. Неабходнасць маніторынгу канфесійнай сітуацыі звязана з актуалізацыяй рэлігійнага сегмента забеспячэння нацыянальнай дзяржаўнай бяспекі ва ўмовах актывізацыі рэлігійнага жыцця, росту ўплыву рэлігійных арганізацый пад уздзеяннем «рэлігійна-царкоўнага рэнесансу» мяжы пачатку 1990-х гг. [1, с. 4-14; 2, с. 20-23]. Рэалізацыя «адкладзенага» ў савецкі перыяд сацыяльнага попыту на рэлігію стала магчымай ва ўмовах постсавецкага лібералізму ў веравызнальнай сферы, які выражаўся ў зняцці шэрагу ранейшых абмежаванняў рэлігійнай дзейнасці, у тым ліку спрашчэнні працэдуры легалізацыі абшчын, у рэлігійнай ангажаванасці шматлікіх сродкаў масавай інфармацыі, актыўнасці рэлігійнай прапаганды праз місіянерскую дзейнасць і інш. Аб’ектывізацыя новых грамадскіх адносін у рэлігійнай сферы атрымала адлюстраванне ў больш чым трохразовым росце як колькасці рэлігійных напрамкаў, так і колькасці дзеючых рэлігійных абшчын. Рост рэлігійнай актыўнасці ахапіў усе рэгіёны краіны пры нераўнамернай інтэнсіўнасці канфесійных працэсаў.

© Старасценка В. У., 2024

## Асноўная частка

Рэлігійнае жыццё сучаснай Беларусі на пачатак 2020 г. прадстаўлена ў яе ўсходнім рэгіёне (Віцебская, Магілёўская і Гомельская вобласці) 1276 абшчынамі 21 канфесіі – абсалютнай большасці рэлігійных напрамкаў у краіне (25 канфесій). У рэгіёне найбольшая колькасць абшчын дзейнічае ў Віцебскай вобласці (560), менш за ўсё – у Магілёўскай вобласці (294), у Гомельскай – 422. Найбольш высокі індэкс канфесійнай дыверсіфікацыі (20 канфесій, або 80 %, што саступае толькі г. Мінску – 22 канфесіі ) уласцівы Магілёўскай вобласці, у іншых абласцях усходнебеларускага рэгіёна – 68 % (па 17 канфесій) [3, с. 79].

Таксама ў рэгіёне дзейнічалі 955 культавых будынкаў (35 % ад рэспубліканскай колькасці) і 72 будавалася (у рэспубліцы ў цэлым – 2725 і 232). У рэлігійных структурах усіх канфесій былі занятыя 1144 святары – 34 % ад іх рэспубліканскай (3365 чалавек) колькасці. Функцыянавалі 15 абласных рэлігійных аб’яднанняў: Полацкая, Віцебская, Магілёўская, Бабруйская, Гомельская і Тураўская епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, Віцебская і Пінская епархіі і Мінска-Магілёўская архідыяцэзія Рымска-каталіцкай царквы, Віцебскае, Магілёўскае і Гомельскае аб’яднанні хрысціян веры евангельскай і евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Абшчыны шэрагу канфесій належаць да іншых (рэспубліканскіх па статусе) рэлігійных аб’яднанняў Стараабрадніцкай царквы, Евангелічна-Лютэранскай царквы, Хрысціян поўнага Евангелля, Адвентыстаў сёмага дня, Новаапостальскай царквы, Сведкаў Іеговы, мусульман, іўдзеяў, бахаі, а таксама могуць дзейнічаць аўтаномна.

Зарэгістраваныя ва ўсходняй Беларусі рэлігійныя арганізацыі адносяцца да дзвюх сусветных рэлігій (хрысціянства і іслам), аднай нацыянальнай рэлігіі (іўдаізм) і двух новых рэлігійных аб’яднанняў [табліца 1].

Табліца 1 – Рэлігіі і рэлігійныя арганізацыі ва ўсходняй Беларусі паводле гістарычнай тыпалогіі рэлігій (зарэгістраваныя па стане на 1 студзеня 2020 г.)

<table>
<tr><td rowspan="17">Сусветныя рэлігіі</td><td rowspan="16">Хрысціянства</td><td rowspan="2">Праваслаўе</td><td colspan="2">Беларуская праваслаўная царква</td></tr>
<tr><td colspan="2">Стараабрадніцкая царква</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Каталіцызм</td><td colspan="2">Рымска-каталіцкая царква</td></tr>
<tr><td colspan="2">Грэка-католікі</td></tr>
<tr><td rowspan="11">Пратэстантызм</td><td rowspan="2">Ранні пратэстантызм</td><td>Лютэранская царква</td></tr>
<tr><td>Прэсвітэрыянская царква</td></tr>
<tr><td rowspan="9">Позні пратэстантызм</td><td>Хрысціяне веры евангельскай</td></tr>
<tr><td>Хрысціяне поўнага Евангелля</td></tr>
<tr><td>Евангельскія хрысціяне-баптысты</td></tr>
<tr><td>Адвентысты сёмага дня</td></tr>
<tr><td>Сведкі Іеговы</td></tr>
<tr><td>Новаапостальская царква</td></tr>
<tr><td>Царква Хрыстова</td></tr>
<tr><td>Мармоны</td></tr>
<tr><td>Месіянскія абшчыны</td></tr>
<tr><td>Монафізіцтва</td><td colspan="2">Армянская апостальская царква</td></tr>
<tr><td colspan="4">Іслам (мусульманская рэлігія)</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Нацыянаныя рэлігіі</td><td rowspan="2">Іўдаізм</td><td colspan="3">Іўдзейская рэлігія (артадаксальны іўдаізм)</td></tr>
<tr><td colspan="3">Прагрэсіўны іўдаізм</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Новыя рэлігійныя аб'яднанні</td><td colspan="4">Крышнаіты</td></tr>
<tr><td colspan="4">Бахаі</td></tr>
</table>

У параўнанні з канфесійнай структурай Рэспублікі Беларусь у цэлым у яе ўсходнім рэгіёне дзейнічае адзіная ў краіне абшчына прэсвітэрыян, але адсутнічаюць зарэгістраваныя арганізацыі чатырох канфесій – каталікоў лацінскага абраду, рэфарматаў, хрысціян веры апостальскай і будызму. Аднак яны дзейнічаюць у адзінкавых абласцях краіны, малалікія па колькасці аб'яднаных абшчын (14), таму дадзеная асаблівасць істотным фактарам спецыфікі рэгіёна не з'яўляецца. Больш значнай асаблівасцю выступае высокая ўдзельная вага ў рэгіёне стараабраднікаў (79 % ад рэспубліканскай колькасці абшчын), лютэран (84 %), месіянскіх абшчын (67 %), іегавістаў (56 %), артадаксальнага іўдаізму (71 %) і бахаі (60 %).

Адначасова захоўваецца высокая ступень стабільнасці канфесійнай структуры ўсходняй Беларусі. За апошнія 20 гадоў афарміліся і прайшлі працэдуру дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыі чатырох канфесій – месіянскіх абшчын (2002 г.), прэсвітэрыян і мармонаў (2004 г.), армяна-грыгарыян (2012 г.). Колькасць канфесій тым самым узрасла больш чым на 23 %, аднак колькасць абшчын гэтых канфесій невялікая – 10 арганізацый, што складае толькі 0,8 % ад агульнага аб'ёму рэлігійных абшчын рэгіёна.

Рэлігійная структура рэгіёна мае выразны поліканфесійны характар з абсалютным дамінаваннем арганізацый хрысціянскага тыпу. Да хрысціянства адносяцца 16 рэлігійных напрамкаў з 21, якія маюць афіцыйную рэгістрацыю (у рэспубліцы ў цэлым – 19 з 25). Хрысціянскія канфесіі аб'ядноўваюць 96 % зарэгістраваных абшчын. Вернікі, якія вызнаюць хрысціянства, належаць да праваслаўя, каталіцызму, монафізіцтва і пратэстантызму. Пры гэтым, як і ў іншых абласцях і ў рэспубліцы ў цэлым, адсутнічае абсалютнае дамінаванне якой-небудзь адной канфесіі. Найбольш трывалыя пазіцыі па колькасці рэлігійных арганізацый займаюць Беларуская праваслаўная царква (БПЦ) [4], Хрысціяне веры евангельскай (ХВЕ) [5], Рымска-каталіцкая царква (РКЦ) і Евангельскія хрысціяне-баптысты (ЕХБ) [табліца 2], гэтая паслядоўнасць па колькасці абшчын аналагічная агульнарэспубліканскай сітуацыі.

У рэгіянальным вымярэнні абшчыны БПЦ (675 абшчын) займаюць каля 53 % ад усёй сукупнасці рэлігійных абшчын усходняй Беларусі, каля 13 % – ХВЕ (169 абшчын), каля 11 % – РКЦ (138 абшчын), каля 8 % – ЕХБ (104 абшчыны). На астатнія 17 канфесій (12 хрысціянскіх і 5 нехрысціянскіх) у цэлым прыпадае толькі 190 ад агульнай колькасці рэлігійных абшчын усходняй Беларусі, іх удзельная вага – толькі каля 15 % абшчын рэгіё-

на. Па асноўных групах канфесій праваслаўе (БПЦ і стараабраднiцтва) займае каля 55 % абшчын, каталіцызм (РКЦ і ўніяты) – каля 11 %, пратэстантызм усіх 11 напрамкаў – каля 30 %.

Табліца 2 – Рэлігійныя абшчыны ва ўсходняй Беларусі (на 1 студзеня 2020 г.)

| № | Найменне канфесіі | Віцебская вобласць | Гомельская вобласць | Магілёўская вобласць | усяго ва ўсходняй Беларусі | усяго ў рэспубліцы | % абшчын ва ўсходняй Беларусі ад колькасці абшчын усіх канфесій у рэгіёне | % абшчын ва ўсходняй Беларусі ад колькасці ўсіх абшчын канфесіі ў рэспубліцы |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Праваслаўная царква (БПЦ) | 297 | 241 | 137 | 675 | 1709 | 52,9 | 39,50 |
| 2 | Стараабрадніцкая царква | 18 | 2 | 7 | 27 | 34 | 2,1 | 79,41 |
| 3 | Рымска-каталіцкая царква | 94 | 20 | 24 | 138 | 498 | 10,8 | 27,71 |
| 4 | Каталікі лацінскага абраду | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 | 0 |
| 5 | Грэка-каталіцкая царква | 4 | 1 | 1 | 6 | 16 | 0,5 | 37,50 |
| 6 | Армянская апостальская царква | 0 | 0 | 2 | 2 | 4 | 0,2 | 50 |
| 7 | Рэфармацкая царква | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 | 0 |
| 8 | Прэсвітэрыянская царква | 0 | 0 | 1 | 1 | 1 | 0,1 | 100 |
| 9 | Лютэранская царква | 13 | 4 | 4 | 21 | 25 | 1,6 | 84 |
| 10 | Евангельскія хрысціяне-баптысты | 38 | 26 | 40 | 104 | 281 | 8,2 | 37,01 |
| 11 | Новаапостальская царква | 3 | 5 | 2 | 10 | 21 | 0,8 | 47,62 |
| 12 | Хрысціяне веры евангельскай | 52 | 75 | 42 | 169 | 524 | 13,2 | 32,25 |
| 13 | Хрысціяне поўнага Евангелля | 7 | 16 | 3 | 26 | 62 | 2 | 41,94 |
| 14 | Хрысціяне веры апостальскай | 0 | 0 | 0 | 0 | 11 | 0 | 0 |
| 15 | Царква Хрыстова | 0 | 0 | 1 | 1 | 5 | 0,1 | 20 |
| 16 | Месіянскія абшчыны | 0 | 2 | 0 | 2 | 3 | 0,2 | 66,67 |
| 17 | Адвентысты сёмага дня | 14 | 12 | 6 | 32 | 73 | 2,5 | 43,84 |
| 18 | Сведкі Іеговы | 5 | 7 | 3 | 15 | 27 | 1,2 | 55,56 |
| 19 | Мармоны | 1 | 0 | 1 | 2 | 4 | 0,2 | 50 |
| 20 | Іўдзейская рэлігія | 5 | 7 | 15 | 27 | 38 | 2,1 | 71,05 |
| 21 | Прагрэсіўны іўдаізм | 3 | 1 | 2 | 6 | 15 | 0,5 | 40 |
| 22 | Мусульманская рэлігія | 4 | 1 | 1 | 6 | 24 | 0,5 | 25 |
| 23 | Бахаі | 1 | 1 | 1 | 3 | 5 | 0,2 | 60 |
| 24 | Крышнаіты | 1 | 1 | 1 | 3 | 6 | 0,2 | 50 |
| 25 | Будызм | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 | 0 |
| | **Усяго** | **560** | **422** | **294** | **1276** | **3389** | **100** | **37,65** |

Прадстаўленасць канфесій у рэгіянальнай прасторы ўсходняй Беларусі 2000-х гг. мела пэўную дынаміку. Па асноўных канфесіях: павялічвалася, як і ў рэспубліцы ў цэлым [6, с. 19], доля абшчын БПЦ (з 46,8 % у 2000 г. да 52,9 % у 2020 г.), але зменшылася доля РКЦ (з 12,5 % да 10,8 %), ХВЕ (з 15,6 % да 13,2 %), ЕХБ (з 9,5 % да 8,2 %) [табліца 3].

У рэспубліканскім вымярэнні доля абшчын усходняй Беларусі ад агульнарэспубліканскай колькасці абшчын складае 37,7 % [табліца 3] (у тым ліку Віцебшчына – 16,5 %, Гомельшчына – 12,5 %, Магілёўшчына – 8,7 %). Пры гэтым удзельная вага рэлігійных абшчын як усходняй Беларусі ў цэлым, так і асобных усходнебеларускіх абласцей у агульнай колькасці рэлігійных абшчын Рэспублікі Беларусь перажывала змены, мела месца тэндэнцыя яе росту. Так, удзельная вага абшчын рэгіёна ў 2000 г. складала 32,6 %, у 2005 г. – 35,5 %, 2010 г. – 37 %, 2015 г. – 37,4 %, 2020 г. – 37,7 %. Па абласцях: удзельная вага рэлігійных абшчын Магілёўскай вобласці павялічылася з 6,1 % у 2000 г. да 8,7 % у 2020 г., Віцебскай вобласці за той жа перыяд – з 14,4 % да 16,5 %, Гомельскай вобласці – з 11,4 % да 12,5 %. Дадзеная тэндэнцыя звязана з параўнальна нізкай актыўнасцю ў 2000-х гг. у справе стварэння новых абшчын у заходняй Беларусі (у агульнарэспубліканскай сукупнасці рэлігійных абшчын скарацілася ўдзельная вага абшчын Брэсцкай (з 24,6 % да 22,6 %) і Гродзенскай (з 17,5 % да 14,3 %) абласцей) [3, с. 17].

Табліца 3 – Дынаміка ўдзельнай вагі рэлігійных абшчын усходняй Беларусі ад рэгіянальнай і рэспубліканскай колькасці ў 2000–2020 гг. (на 1 студзеня ўказаных гадоў)

| № п/п | Канфесіі | Колькасць рэлігійных абшчын ва ўсходняй Беларусі | | | % абшчын ва ўсходняй Беларусі ад колькасці абшчын усіх канфесій у рэгіёне | | | % абшчын ва ўсходняй Беларусі ад колькасці ўсіх абшчын канфесіі ў рэспубліцы | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2000 | 2010 | 2020 | 2000 | 2010 | 2020 | 2000 | 2010 | 2020 |
| 1 | Праваслаўная царква (БПЦ) | 384 | 583 | 675 | 46,8 | 50,7 | 52,9 | 33,7 | 38,6 | 39,5 |
| 2 | Стараабрадніцкая царква | 28 | 26 | 27 | 3,4 | 2,3 | 2,1 | 80 | 81,3 | 79,4 |
| 3 | Рымска-каталіцкая царква | 103 | 132 | 138 | 12,5 | 11,5 | 10,8 | 25,4 | 28,1 | 27,7 |
| 4 | Грэка-каталіцкая царква | 5 | 5 | 6 | 0,6 | 0,4 | 0,5 | 38,5 | 35,7 | 37,5 |
| 5 | Армянская апостальская царква | 0 | 0 | 2 | 0 | 0 | 0,2 | 0 | 0 | 50 |
| 6 | Прэсвітэрыянская царква | 0 | 1 | 1 | 0 | 0,1 | 0,1 | 0 | 100 | 100 |
| 7 | Лютэранская царква | 2 | 21 | 21 | 0,2 | 1,8 | 1,6 | 40 | 77,8 | 84 |
| 8 | Хрысціяне веры евангельскай | 128 | 160 | 169 | 15,6 | 13,9 | 13,2 | 28,9 | 31,9 | 32,3 |
| 9 | Хрысціяне поўнага Евангелля | 23 | 22 | 26 | 2,8 | 1,9 | 2 | 42,6 | 40 | 41,9 |
| 10 | Евангельскія хрысціяне-баптысты | 78 | 102 | 104 | 9,5 | 8,9 | 8,2 | 32 | 37,5 | 37 |
| 11 | Адвентысты сёмага дня | 19 | 32 | 32 | 2,3 | 2,8 | 2,5 | 39,6 | 44,4 | 43,8 |
| 12 | Сведкі Іеговы | 12 | 14 | 15 | 1,5 | 1,2 | 1,2 | 57,1 | 53,8 | 55,6 |
| 13 | Новаапостальская царква | 10 | 10 | 10 | 1,2 | 0,9 | 0,8 | 50 | 47,6 | 47,6 |
| 14 | Царква Хрыстова | 1 | 1 | 1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 16,7 | 20 | 20 |
| 15 | Месіянскія абшчыны | 0 | 1 | 2 | 0 | 0,1 | 0,2 | 0 | 50 | 66,7 |
| 16 | Мармоны | 0 | 2 | 2 | 0 | 0,2 | 0,2 | 0 | 50 | 50 |
| 17 | Іўдзейская рэлігія | 10 | 17 | 27 | 1,2 | 1,5 | 2,1 | 50 | 56,7 | 71,1 |
| 18 | Прагрэсіўны юдаізм | 5 | 8 | 6 | 0,6 | 0,7 | 0,5 | 62,5 | 50 | 40 |
| 19 | Мусульманская рэлігія | 6 | 6 | 6 | 0,7 | 0,5 | 0,5 | 25 | 24 | 25 |
| 20 | Бахаі | 3 | 3 | 3 | 0,4 | 0,3 | 0,2 | 50 | 60 | 60 |
| 21 | Крышнаіты | 4 | 3 | 3 | 0,5 | 0,3 | 0,2 | 57,1 | 50 | 50 |
| | **Усяго** | **821** | **1149** | **1276** | **100** | **100** | **100** | **32,6** | **37** | **37,7** |

Пры гэтым захоўваюцца традыцыйныя асаблівасці рэлігійнай геаграфіі Беларусі, якія выяўляюцца ў тым, што вобласці ўсходняй Беларусі адрозніваюцца пераважна як ніжэйшай канцэнтрацыяй рэлігійных абшчын, так і індэксамі канфесійнай актыўнасці насельніцтва. Найменшая ў рэспубліцы колькасць рэлігійных абшчын на пачатак 2020 г. захоўвалася ў Магілёўскай (8,7 %) і Гомельскай (12,5 %) абласцях, дзе пражывала 10,9 % і 14,7 % насельніцтва рэспублікі. Інакш кажучы, на долю гэтых дзвюх абласцей у дачыненні да агульнарэспубліканскай статыстыкі прыпадае больш за 26 % насельніцтва, але толькі каля 22 % рэлігійных абшчын. Наадварот, найбольшая колькасць рэлігійных абшчын на пачатак 2020 г. захоўвалася ў Брэсцкай (каля 22,6 %) і Мінскай (каля 21 %) абласцях, дзе пражывае 14,3 % і 15,6 % насельніцтва рэспублікі. Тым самым на долю гэтых дзвюх абласцей прыпадае каля 30 % насельніцтва, але каля 44 % усіх рэлігійных абшчын Беларусі.

Індэкс канфесійнай актыўнасці насельніцтва ў абласцях Рэспублікі Беларусь вызначаецца суадносінамі колькасці насельніцтва з колькасцю рэлігійных абшчын. Найбольшая канфесійная актыўнасць у Брэсцкай вобласці (каля 1,8 тыс. чалавек на адну зарэгістраваную абшчыну). Найбольш блізкія індэксы маюць Віцебская (каля 2), Мінская (каля 2,1) і Гродзенская (каля 2,1) вобласці. Індэксы найменшай канфесійнай актыўнасці сярод абласцей краіны: Гомельшчыны – каля 3,3, Магілёўшчыны – каля 3,5 [3, с. 78].

Рост колькасці рэлігійных арганізацый ва ўсходняй Беларусі як значная праява «рэлігійна-царкоўнага рэнесансу» захоўваўся і ў 2000-х гг. Калі на пачатак 2000 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях налічвалася 17 афіцыйна прызнаных канфесій, то на 1 студзеня 2020 г. – 21 (рост у 1,2 раза), колькасць зарэгістраваных рэлігійных абшчын узрасла за той жа перыяд з

821 (2000 г.) да 1149 (2010 г.) і 1276 (2020 г.), г. зн. у 1,6 разы.

Пры гэтым ужо з сярэдзіны 1990-х гг. у рэспубліцы назіраецца тэндэнцыя стабілізацыі росту колькасці абшчын, а з канца 1990-х гг. фіксуецца зніжэнне станоўчай дынамікі росту [7, с. 579]. Ва ўсходніх абласцях Беларусі ў 2000-х гг. гэтая тэндэнцыя таксама мела месца [малюнак 1]. Так, калі за пяцігадовы пэрыяд 2001–2005 гг. рост склаў 160 абшчын, то за 2006–2010 гг. – 141, за 2011–2015 гг. – 69, а за 2016–2020 гг. – 34. Прырост колькасці рэлігійных абшчын у другім дзесяцігоддзі 2000-х гг. (103) скараціўся ў параўнанні з першым дзесяцігоддзем (301) прыкладна ў 3 разы, што ў цэлым адпавядае агульнарэспубліканскай дынаміцы.




Малюнак 1 – Колькасць зарэгістраваных рэлігійных абшчын па гадах ва ўсходняй Беларусі ў 2000–2020 гг. (за названыя гады)

Сацыялагічныя даследаванні ў галіне рэлігіі выяўляюць спецыфіку светапоглядных арыентацый насельніцтва рэгіёнаў. Матэрыялы 2000-х гг. паказвалі, што найбольш высокі ўзровень фармальнай рэлігійнай самаідэнтыфікацыі дэманструюць рэспандэнты заходнебеларускіх абласцей – Гродзенскай (65,5 %) і Брэсцкай (64 %), а ва ўсходняй Беларусі – жыхары Віцебскай вобласці (64 %). Наадварот, у Магілёўскай вобласці толькі 52,5 % (ніжэй толькі ў г. Мінску – 50 %) рэспандэнтаў заяўляла, што «вераць у Бога», у Гомельскай – 61,6 %. Найбольшая колькасць «няверуючых» – у Віцебскай вобласці (20,3 %), г. Мінску (16,2 %) і Магілёўскай вобласці (14 % рэспандэнтаў) [8, с. 52].

З пункту гледжання канфесійнай самаідэнтыфікацыі ў частцы «праваслаўнай арыентацыі» ў рэспубліцы лідзіруюць рэспандэнты Гомельскай (87,3 %) і Магілёўскай (82,1 %) абласцей, тады як на Віцебшчыне праваслаўе мае толькі 66,2 % канфесійных пераваг, менш толькі на Гродзеншчыне (56,9 %), тады як у рэспубліцы ў цэлым – каля 80 %. У частцы «каталіцкай арыентацыі» вылучаюцца жыхары Віцебскай вобласці (8,9 %), традыцыйна саступаючы Міншчыне (11,8 %) і Гродзеншчыне (29,9 %). Аб тым, што не належаць «ні да якой» канфесіі, заяўлялі 22,9 % рэспандэнтаў Віцебскай вобласці, што з'яўляецца найбольш высокім паказчыкам у Рэспубліцы Беларусь у цэлым. Толькі Віцебшчыне і г. Мінску (18,8 %) у гэтых адносінах саступае Магілёўшчына (15,6 %). Трэцяя вобласць усходняй Беларусі – Гомельская – мае найбольш нізкі ў краіне паказчык канфесійнай індыферэнтнасці, нараўне з Гродзенскай вобласцю (8,3 % і 6,9 % адпаведна) [8, с. 52].

**Заключэнне**

Усходняя Беларусь па ступені канфесійнай актыўнасці саступае заходняй частцы краіны, канцэнтруючы менш як 38 % рэлігійных абшчын. У Магілёўскай і Гомельскай абласцях – найменшая як у рэгіёне, так і ў рэспубліцы ў цэлым колькасць рэлігійных арганізацый (8,7 % і 12,5 % адпаведна). Найбольшым дынамізмам канфесійнага жыцця, наадварот, адрозніваецца Віцебшчына (16,5 % абшчын ад рэспубліканскай колькасці). Пры гэтым Магілёўская вобласць мае найбольш высокую сярод усіх абласцей краіны ступень канфесійнай разнастайнасці.

У поліканфесійнай структуры рэгіёна абсалютна дамінуюць хрысціянскія арганізацыі, якія аб'ядноўваюць 96 % рэлігійнай супольна-

сці рэгіёна. Вядучую ролю, як і ў Беларусі ў цэлым, адыгрываюць Беларуская праваслаўная царква (каля 53 % ад усіх рэлігійных абшчын рэгіёна), Хрысціяне веры евангельскай (каля 13 %), Рымска-каталіцкая царква (каля 11 %) і Евангельскія хрысціяне-баптысты (каля 8 %). Пры гэтым з усіх асноўных канфесій толькі БПЦ у 2000-х гг. мела тэндэнцыю росту ўдзельнай вагі абшчын у рэгіянальным вымярэнні. У цэлым для канфесійнай прасторы сучаснай усходняй Беларусі характэрна зніжэнне дынамікі росту, але пры захаванні перманентнага росту колькасці рэлігійных арганізацый і большай актыўнасці ў справе стварэння новых рэлігійных абшчын у параўнанні з заходняй часткай краіны.

У сацыялагічным вымярэнні найбольш высокі ўзровень фармальнай рэлігійнай самаідэнтыфікацыі ў рэгіёне дэманструюць рэспандэнты Віцебшчыны (64 %), тады як самы нізкі – у Магілёўскай вобласці (53 %), а ў Гомельскай – каля 62 %. Найбольшая ў рэспубліцы колькасць «няверуючых» у Віцебскай (20 %) і Магілёўскай (14 % рэспандэнтаў) абласцях. Найбольш высокая не толькі ў рэгіёне, але і ў краіне ступень «праваслаўнай арыентацыі» назіраецца ў насельніцтва Гомельскай (87 %) і Магілёўскай (82 %) абласцей. Найбольшую ў рэгіёне ступень прыхільнасці да каталіцызму дэманструе Віцебшчына (9 %), а Гомельская вобласць выдзяляецца самым нізкім у рэспубліцы паказчыкам канфесіянальнага індыферэнтызму.

За гады суверэнітэту Беларусі рэлігійнае жыццё ўсходнебеларускага рэгіёна, як і рэспублікі ў цэлым, значна змянілася. Канструктыўнае дзяржаўна-канфесійнае супрацоўніцтва, паважлівыя міжканфесійныя ўзаемаадносіны, падтрыманне згоды прадстаўнікоў розных рэлігій з’яўляюцца важным гарантам развіцця агульнаграмадзянскай ідэнтычнасці, сацыяльнага міру і грамадскай згоды.

### *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. ***Старостенко, В. В.*** Современная религиозная ситуация и конфессии в Республике Беларусь: пособие / В. В. Старостенко. – Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2008. – 88 с.
2. ***Старостенко, В. В.*** Религии в современной Беларуси: пособие / В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2012. – 192 с.
3. ***Старостенко, В. В.*** Религии в Республике Беларусь в статистическом измерении: справочник / В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2021. – 144 с. : ил.
4. ***Старостенко, В. В.*** Особенности региональной структуры и динамика развития Белорусской православной церкви в восточной Беларуси в 2000-х гг. / В. В. Старостенко // Веснік МДУ імя А. А. Куляшова. Сер. А. Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2019. – № 2 (54). – С. 91–97.
5. ***Старостенко, В. В.*** Динамика развития и особенности структуры Христиан веры евангельской в восточной Беларуси в период 2000-х гг. / В. В. Старостенко // Веснік МДУ імя А. А. Куляшова. Сер. А. Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2020. – № 1 (55). – С. 81–86.
6. Православная церковь в белорусском обществе в конце XX – начале XXI в. : монография / О. В. Дьяченко [и др.]; под ред. О. В. Дьяченко. – Могилев : УО «МГУ имени А. А. Кулешова», 2012. – 224 с: ил.
7. История белорусской государственности : в 5 т. Т. 5. Национальная государственность на переломе эпох (вторая половина XX – начало XXI в.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома Н. В. Смехович ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларуская навука, 2020. – 759 с.
8. Конфессии и культовые сооружения Беларуси : атлас / Белорус. гос. ун-т, геогр. фак.; под рук. И. И. Пирожника. – Минск : БГУ, 2007. – 56 с.


Паступіў у рэдакцыю 23.03.2024 г.
Кантакты: starostenko@msu.by (Старасценка Віктар Уладзіміравіч)

***Starascienka V. U.*** **CONFESSIONAL SPECIFICS OF MODERN EASTERN BELARUS**

*The article is devoted to the specifics and dynamics of the development of the religious structure of eastern Belarus considered in the context of the republican religious situation. The analysis of broad statistical material makes it possible to point out regional features and trends in confessional processes. The distinctive characteristics of the region are revealed in terms of the religious and confessional self-identification of the population.*

**Keywords:** religion, confession, eastern Belarus, religious processes, confessional dynamics, religious structure.